Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

21 ЧЭРВЕНЯ 2022 г. АЎТОРАК

№ 119 (29741)

ЗВЯЗДА

СПАЖЫВЕЦКАЕ КРЭДЫТАВАННЕ АДНАЎЛЯЕЦЦА 3

ЯХІМОЎШЧЫНА: ПА СЦЕЖКАХ КУПАЛЫ 6

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ГЭТА РЭВАЛЮЦЫЯ БУДЗЕ НА ВЁСЦЫ»

Прэзідэнт лічыць, што стаўку трэба рабіць на азімы ячмень і рапс

Фота Belta.by

Учора Аляксандр Лукашэнка здзейсніў рабочую паездку ў Шклоўскі раён Магілёўскай вобласці. Кіраўнік дзяржавы пасля прыбыцця на поле, дзе ў парадку эксперыменту пасеяны розныя сарты азімага ячменю, падкрэсліў, што сёння гістарычны і пераломны момант у сельскай гаспадарцы. Прэзідэнт адзначыў, што вырас у гэтых месцах на стыку Магілёўскай і Віцебскай абласцей і тут жа выпрабоўвае розныя новыя падыходы ў сельскай гаспадарцы. «Вось і стала поле Прэзідэнта. Сёння гістарычны момант. Калі нехта думае, што мы тут сустрэліся для таго, каб чарговы раз пагаварыць і паказацца, спецыялісты зразумеюць, што гэта не так», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь знаходзіцца ў зоне рызыкоўнага земляробства. Адна з праблем сельскай гаспадаркі — кароткі перыяд вегетацыі раслін. Ад пасеву да ўборкі праходзіць кароткі прамежак часу. І трэба выброшчваць тыя збожжавыя культуры, якія падыходзяць пад гэтыя ўмовы. «Нам трэба выходзіць на 9-10 млн тон збожжавых каласавых», — паставіў ён задачу.

Асабліва гэта тэма — атрыманне дастатковай колькасці якасных збожжавых — актуальная для Віцебскай вобласці і некаторых іншых раёнаў краіны: поўначы Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай абласцей. Прэзідэнт нагадаў, што ў сувязі з гэтым у мінулым годзе рызыкнуў вельмі жорстка паставіць пытанне па вырошчванні азімага ячменю. Яго ўбіраюць раней за іншыя збожжавыя культуры. Гэта дазваляе аператыўна і ў больш ранніе тэрміны атрымаць кармы для жывёлагадоўлі, больш раўнамерна задзейнічаць і абкатаць тэхніку перад масавай уборкай. Такі падыход кіраўнік дзяржавы практыкаваў у тым ліку асабіста ў перыяд працы кіраўніком гаспадаркі. «Нам трэба якаснае добрае збожжа. Калі 10 млн тон атрымаем — шчасце. На гэтых пасяўных плошчах, не скарачаючы аб'ёмы рапсу і іншых. Гэта значыць, за кошт інтэнсіўнага вядзення гаспадаркі», — сказаў Прэзідэнт.

«Ні ў якім разе не скацыцца да вырошчвання ячменю без тэхналогій! Без тэхналогій не трэба гэтым займацца. Для Віцебскай вобласці гэта выхад са становішча. Гэта сапраўды пераломны момант у сельскай гаспадарцы», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да губернатараў і вучоных.

Яшчэ адна тэма рабочай паездкі — вырошчванне рапсу. «Рапс — гэта грошы для сялян. Сёння нават у перыяд гэтых шалёных санкцый Еўропа просіць: «Дайце рапсавы алей!» Трэба выходзіць на мільён (тон ураджаю. — **«Зв.»**). Мы ўжо сёння больш за 700 тысяч (маем. — **«Зв.»**). Нават з гэтымі пасяўнымі плошчамі, што ў нас ёсць, калі так тэхналагічна гаспадарыць, мы будзем мець мільён», — сказаў Прэзідэнт.

«Вось тэма. Гэта павінна пераламаць сельскую гаспадарку. Таму быць азімаму ячменю і быць рапсу. Яшчэ раз тут сустрэнемся, калі будзем весці ўборку і рапсу, і ячменю», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка на экспериментальным полі на сваёй малой радзіме азнаёміўся з пасевамі сучаснага сартоў і адразу адказаў на магчымыя папрокі, што тут дакладна зроблена ўсё па тэхналогіі і на вышэйшым узроўні. У гэтым і сутнасць, звярнуў ён увагу, — дакладнае захаванне тэхналогій дае высокі вынік. І гэта прыклад, які павінны рабіць і ў іншых месцах. «Трэба даць штуршок гэтай вялікай справе. Паверце, гэта рэвалюцыя будзе на вёсцы. Калі ў гэтую галадуху (а голад будзе ў свеце, нават я ўжо ў гэта веру, нягледзячы на балбатню палітыкаў)... Калі мы забяспечым харчовую бяспеку... Мы яе ўжо забяспечылі», — сказаў кіраўнік дзяржавы, рэзюмаваўшы, што калі рэалізаваць усё гэта, то «у нас не будзе ніколі праблем з грашыма».

Прэзідэнт пабываў і на рапсавым полі. «Добры ўраджай і там, і тут. Значыць, умеем апрацоўваць, умеем вырошчваць. Трэба проста ўсё рабіць тэхналагічна правільна», — заўважыў ён і абазначыў пытанне: «Што перашкаджае ўсюды мець такі рапс?»

Размова зайшла і аб забеспячэнні сучаснай тэхнікай, якой у цэлым дастаткова ў сельскай гаспадарцы. Але яна стала даражэйшай і больш складанай. А таму важна, каб спецыялісты беражліва ставіліся да яе і правільна эксплуатавалі.

Паводле БелТА.

ЛЕТНЯЕ ЦЯПЛО

Магілёўскі інжынер-архітэктар па будаўніцтве гарадзянскага і жылога фонду Кацярына ПАВАР са сваёй дачкой Алінай у выхадны дзень адпачываюць на беразе возера Хатомля ў Круглянскім раёне. Вадаём знаходзіцца за шэсцьдзесят кіламетраў ад Магілёва, але сям'я Кацярыны з задавальненнем адпраўляецца ў вандроўку і любіць наведваць гэты прыгожы і ўтульны куточак некранутай прыроды.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі:

«У першую чаргу мы павінны разлічваць на ўласныя сілы і сур'ёзна займацца праектным супрацоўніцтвам, каб узаемна падтрымліваць адно аднаго і не дапусціць неякіх узрушэнняў у эканамічным жыцці. Гэта датычыцца і спажывецкага рынку, і прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння. Прыемна, што большасць навуковых даследаванняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі заканчваюцца прыкладнымі работамі. Галоўныя канструктары вядучых прадпрыемстваў Беларусі і Расійскай Федэрацыі дастаткова высока ацэнілі ўзровень навукова-даследчых работ, якія ажыццяўляюцца ў НАН як у рамках фундаментальных даследаванняў навукова-тэхнічных праграм, так і навуковых распрацовак».

Камунальныя стасункі

РАМАНТАВАЦЬ АБО ЗНОСІЦЬ?

Як вырашаць праблемы капрамонту жылля

Адказ на гэтае і іншыя пытанні шукалі падчас выязной калегіі ў Стоўбцах спецыялісты Міністэрства ЖКГ разам з камунальнікамі Міншчыны. Апошнія расказалі пра асабівасці жыллёвага фонду вобласці і праблемныя пытанні капрамонту, а таксама падзяліліся сваімі дасягненнямі і прапановамі ў сферы паляпшэння жыллёвых умоў насельніцтва. Мэта капрамонту — не дапусціць старэння ці недарамонту, і бадай адзіная яго праблема — недахоп фінансавых сродкаў, лічаць камунальнікі. Тым не менш задача штогод рамантаваць 3 % будынкаў ад усяго жылфонду, які эксплуатуецца ў краіне, застаецца, як трэба дасягаць, і субсідзіраванне работ на гэта працягнецца. Аднак жыхары павінны ўсведаміць, што за станам свайго дома трэба своечасова сачыць самастойна і выкарыстоўваць для гэтага існуючыя ў краіне законы. СТАР. 3

Дапамога

ВЯРНУЦЦА «Ў СТРОЙ» ПАСЛЯ ХВАРОБЫ

Якія магчымасці па рэабілітацыі сёння існуюць і ці для ўсіх?

Згодна са статыстыкай, колькасць людзей, якія выжываюць пасля цяжкіх траўмаў, ці хворых, якія перанеслі складаныя анкалагічныя аперацыі і жывуць пяць і больш гадоў, расце. Сёння ўсё больш магчымасцяў для выздараўлення дзяцей, якія нарадзіліся з вагой менш за кілаграм. Каму з іх паказана рэабілітацыя і на якіх умовах? Ці маюць права на яе інваліды? Як у хуткім часе зменяцца тэрміны рэабілітацыі і пералік тых, каму яна паказана? Якія сацыяльныя гарантыі сёння маюць «людзі з асаблівасцямі развіцця»? У прыватнасці, як можна атрымаць запатрабаваную прафесію і чым дзяржава дапамагае ў пошуку месца працы? Пра гэта і іншае расказалі спецыялісты.

Пасля інфарктаў, інсультаў, траўмаў, анкалогіі...

Сістэма медыцынскай рэабілітацыі ўключае некалькі этапаў: лячэбна-рэабілітацыйны, калі аднаўленне пачынаецца яшчэ ў рэанімацыі ці профільным аддзяленні стацыянара. Затым пацыента пераводзяць у аддзяленне ранняй стацыянарнай медыцынскай рэабілітацыі ці цэнтр медыцынскай рэабілітацыі. Таксама ёсць хатні этап рэабілітацыі, паўторная рэабілітацыя. Такая этапная сістэма прадугледжвае пастаянную медыцынскую дапамогу для мінімізацыі ці поўнай ліквідацыі парушэнняў, якія прыводзяць да фізічных абмежаванняў.

— Гэта сістэма працуе не толькі на паперы, — кажа **дырэктар РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Васіль СМЫЧОК.** — З профільных стацыянараў да нас на рэабілітацыю паступаюць пацыенты пасля цяжкіх траўмаў, анкалагічных хвароб, аперацый, інфарктаў, інсультаў, і мы бачым, наколькі можам дапамагчы такім людзям, каб яны вярнуліся да паўнацэннага жыцця.

Праўда, гэта магчыма не заўсёды. Часам абмежаванні жыццядзейнасці прыводзяць да інваліднасці. Ці паказана рэабілітацыя інвалідам? Безумоўна, прычым як дарослым, так і дзецям. Паказанні для медыцынскай рэабілітацыі і яе тэрміны рэгулююцца адпаведным загадам профільнага міністэрства. СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэзідэнтам Калумбіі абралі прадстаўніка левых сіл

У Калумбіі па выніках другога тура выбараў прэзідэнтам абралі 62-гадовага сенатара Густава Петра. За яго аддалі галасы 50,45 % выбаршчыкаў, паведаміла ТАСС. Густава Петра прадстаўляе кааліцыю «Гістарычны пакт». Такім чынам, Калумбію ўпершыню ўзначаліць прадстаўнік левых сіл. Да гэтага палітык двойчы балатаваўся на пасаду кіраўніка дзяржавы. У 2012—2015 гадах Петра быў мэрам сталіцы Калумбіі, з 2018-га стаў сенатарам. Як кандыдат, Густава Петра заявіў аб гатоўнасці аднавіць дыпламатычныя адносіны з Венесуэлай, разарваныя ў лютым 2019-га. Акрамя таго, ён прапануе скараціць выкарыстанне нафты і вугалю за кошт пераходу на больш экалагічна чыстыя крыніцы энергіі і зменшыць падаткі для малога і сярэдняга бізнесу ў сельскай гаспадарцы. Палітык паабяцаў правесці рэформу паліцыі, змагацца з перавышэннем паўнамоцтваў праваахоўнікаў і пачаць дыялог з паўстанцкай групоўкай «Армія нацыянальнага вызвалення» для дасягнення пагаднення аб міры.

Кааліцыя Макрона не атрымала пераважную большасць месцаў у парламенце

Кааліцыя прэзідэнта Францыі Эмануэля Макрона «Разам!» перамагла ў другім туры выбараў у французскі парламент, набраўшы 38,57 % галасоў, аднак яна не атрымала пераважную большасць месцаў у парламенце. Аб гэтым паведамілі РІА «Навіны» са спасылкай на МУС краіны. Левая кааліцыя «Новы народны экалагічны і сацыяльны саюз» (Nupes), якую ўзначальвае Жан-Люк Мелаланшон, атрымала 31,6 %. Трэцяе месца па колькасці галасоў заняла партыя Марын Ле Пэн «Нацыянальнае аб'яднанне» (17,3 %). Партыя «Рэспубліканцы» атрымала 6,98 працэнта. Пры гэтым кааліцыя Макрона атрымлівае 245 месцаў, Nupes — 131. «Нацыянальнае аб'яднанне» і «Рэспубліканцы» — 89 і 61 месца адпаведна. Прэм'ер-міністр Францыі Элізабэт Борн лічыць, што страта прэзідэнцкім блокам «Разам!» большасці ў Нацыянальным сходзе (нішэй палаце парламента) уяўляе пагрозу для краіны. Урад плануе шукаць кампрамісы з апазіцыяй.

Грэцыя і Кіпр пасля 21-гадовай паўзы аднавілі мараходныя пасажырскія зносіны

Першы пасажырскі паром днямі здзейсніў паездку з порта Лімасол у Пірэй, паведамілі РІА «Навіны» са спасылкай на тэлеканал Sigma. Перад адпраўкай судна на святочным мерапрыемстве ў порце выступіў прэзідэнт Кіпра Нікас Анастасіядзіс. Ён падкрэсліў, што аднаўленне пасажырскага суднаходства паміж дзвюма краінамі — гістарычная падзея. Яна стала магчымай дзякуючы настойлівасці і намаганням урада. Першымі пасажырамі рэйса сталі 173 чалавекі, сярод якіх міністры суднаходства і турызму, мэр Лімасола, дэпутаты, журналісты. Плануецца, што ў гэтым месяцы будуць арганізаваны чатыры рэйсы ў Пірэй, восем — у лістападзе, сем — у жніўні і тры — у верасні. Апошні рэйс сёлета адбудзецца 16 верасня з Пірэя ў Лімасол.

КАРОТКА

- **Тыдзень моладзі і студэнцтва праходзіць у Беларусі з 20 да 26 чэрвеня і будзе заключацца ў тэматычных мерапрыемствах кожнага дня.**
- Амаль 75 тысяч замежнікаў наведалі Беларусь з 15 красавіка па бязвізе.
- **Рэстаўрацыйныя работы палаца Булгакаў у Жылічах падыходзяць да заканчэння.**
- Новая банкнота наміналам Br100 будзе выпушчана ў абарачэнне з 1 лістапада.
- **Бюджэт Саюзнай дзяржавы ў 2021 годзе выкананы з прафіцытам у 17,5 млн. расійскіх рублёў.**
- Міністэрства аховы здароўя пераглядзела парадак правядзення вакцынацыі супраць COVID-19.

Год гістарычнай памяці

СПРАВА ЖЫЦЦЯ

Унікальны школьны музей стаў цэнтрам краязнаўства

Вера Віктараўна Церахава адпрацавала ў Магілявецкай сярэдняй школе 58 гадоў, на пенсію сышла ў 82 гады. Гэта, згадзіцеся, рэдкі выпадак. Яна выкладала гісторыю, яе жыццёвы лёс таксама ў многім стаў адлюстраваннем гісторыі краіны. Адзін з вынікаў яе работы ў школе — багаты гісторыка-краязнаўчы музей, якім можа ганарыцца не толькі школа і населены пункт, але, напэўна, і раён. Тут сабрана мноства арыгінальных экспанатаў, якія паказваюць мінулае рэгіёна: ад старажытных вякоў да нашага часу.

Па раздзелах — нібы па дзесяцігоддзях

Спачатку варта сказаць, што выпускніца гістарычнага факультэта БДУ пачала збіраць музей, як толькі прыступіла да работы настаўніцай. Энтузіязмам, цікаўнасцю гісторыя заражала вучняў, калег, удзельнічала ў раскопках, слаўных навуковай экспедыцыяй каля вёскі Асошнік. На працягу многіх гадоў энтузіясты-краязнаўцы праводзілі гутаркі, агітавалі мясцовых жыхароў прыносіць бабуліны «запасы» з куфраў і гарышчаў, найбольш дакументальныя. У музеі няма прывычных жорнаў, збанкоў, прасніц альбо лапцей — традыцыйных атрыбутаў этнаграфічных куткоў. Гэта гісторыка-краязнаўчы музей. Тут ёсць дакументы, фрагменты зброі, унікальныя здымкі, эксклюзіўныя рэчы. СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Парламенцкі дзённік

ПРАЦАВАЦЬ НА АПЯРЭДЖАННЕ І ПАГЛЫБЛЯЦЬ ІНТЭГРАЦЫЮ

Такі лейтматыў пасяджэння 62-й сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, якое ўчора адбылося ў Мінску

Акрамя таго, пры ўдзеле спікераў ніжніх палат парламентаў былі абмеркаваны пытанні супрацьдзеяння знешнім выклікам і пагрозам, санкцыйнаму ціску, прапагандзе нацызму, забеспячэнню абароны гістарычнай памяці. Зацверджаны зноў сфарміраваныя склады камісій Парламенцкага сходу, абраны іх старшыні.

Фота БелТА

Адкрываючы пасяджэнне, **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** назваў гэтую сустрэчу сімвалічнай, бо яна адбылася напярэдадні гадавіны пачатку Вялікай Айчыннай вайны. «Мы зноў перажываем лёсавызначальны момант, калі ад нашых дзеянняў залежыць будучыня не толькі Беларусі і Расіі, але і ўсяго свету», — падкрэсліў спікер ніжняй палаты парламента.

Аднак, нягледзячы на беспрэцэдэнтны палітычны і эканамічны ціск, Саюзная дзяржава, па яго словах, годна трымае ўдар. «Робяцца дзейсныя крокі па забеспячэнні ўстойлівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця, недапушчэнні рэзкага падзення ўзроўню жыцця грамадзян, — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка. — Разам з тым мы ведаем, што ціск будзе нарастаць, і ў гэтых умовах жыццёва неабходна працаваць на апярэджанне, паглыбляць інтэграцыйныя працэсы па ўсім спектры нашага ўзаемадзеяння».

У гэтай сувязі перад саюзнымі парламентарыямі пастаўлена задача — актыўна садзейнічаць выкананню 28 саюзных інтэграцыйных праграм. Па кожнай з іх міністэрствамі і ведамствамі Беларусі і Расіі распрацаваны адпаведныя планы рэалізацыі. Пры гэтым каля 35 % з прадугледжаных 938 задач ужо выкананa.

— Варта засяродзіцца на сутнасці праграм і галіновых падпраграм, механізмах і этапах іх рэалізацыі, — звярнуў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Нельга дапускаць, каб рэальная работа падмянялася падрыхтоўкай бясконцых канцэпцый, праектаў і адсоўвала на другі план практычнае ўвасабленне дасягнутых дамоўленасцяў. Тым больш што прынцыповае бачанне шляхоў вырашэння большасці задач ужо сфармiравана.

Другі блок пытанняў, вынесены на парадак дня, датычыўся парадку фарміравання і выканання бюджэту Саюзнай дзяржавы, рэалізацыі саюзных праграм і мерапрыемстваў. Па меркаванні Уладзіміра Андрэйчанкі, у цяперашніх умовах усе сродкі, якія ёсць, павінны быць максімальна задзейнічаны, рэальна працаваць, у тым ліку на супрацьдзеянне санкцыйнай палітыцы Захаду. «Трэба, нарэшце, пазбавіцца ад фармалізму і бюракратызму ў гэтым пытанні, — рэзюмаваў спікер. — Час ідзе, а многія запатрабавальныя праекты ўсё яшчэ знаходзяцца на стадыі ўзгаднення».

Пастаўлена задача больш сур'ёзна падысці і да выбару самых праектаў, зыходзячы з тых прыярытэтаў, якія дыктуе жыццё. Як заўважыў Уладзімір Андрэйчанка, сур'ёзныя задачы стаяць перад парламентарыямі і ў кантэксце адстойвання агульных пазіцый на міжнародных арэне. «Мы бачым, як калектыўны Захад спрабуе выцiснуць нас з міжнародных парламенцкіх пляцоўак, усяляк заглушыць наш голас, — акцэнтаваў увагу спікер ніжняй палаты парламента. — Іх дыпламатыя сёння зводзіцца да вядомага прынцыпу «хто не з намі, той супраць нас». Такое становішча спраў, безумоўна, выклікае неспакой не толькі ў нас, але і ў многіх краін, якія праводзяць незалежную міралюбівую курс. Мы павінны тлумачыць абсурднасць санкцыйнай палітыкі, рэагаваць на адкрытыя варожыя выпады і правакацыі, развіваць супрацоўніцтва з тымі краінамі, якія гатовы працаваць на прынцыпах роўнасці і ўзаемапаразумення».

Паралельна для прасоўвання эканамічных інтарэсаў Беларусі і Расіі плануецца задзейнічаць магчымасці міжпарламенцкіх пляцовак. Увага Парламенцкага Сходу — і на ўмацаванне сувязяў з найбуйнейшымі эканомікамі Кітая, Індыі, Паўднёва-Усходняй Азіі, раскрышцё патэнцыялу краін Блізкага Усходу, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі.

Як лічыць **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ,** у поўнай меры неабходна выкарыстоўваць эканамічныя санкцыі краін калектыўнага Захаду як адпраўную кропку новай індустрыялізацыі, на аснове якой мы здолеем выбудаваць поўны тэхналагічны суверэнітэт Саюзнай дзяржавы — ад імпартазамяшчэння да стварэння новых вытворчасцяў і выпуску новай патрэбнай нам прадукцыі. «І далей — да глабальнага лідарства ў ключавых галінах рэальнай вытворчасці, якая забяспечвае рэальныя патрэбы нашых грамадзян, — удакладніў дэпутат. — Тады нашы працаўнікі будуць не толькі пасаромленыя, але і поўнасцю спрацаваць магчымасць пагражаць нашаму паступальному сацыяльна-эканамічнаму развіццю, а таксама дабрабыту нашых людзей».

Як заявіў па выніках пасяджэння сесіі Уладзімір Андрэйчанка, беларуска-расійскія адносіны выпрацавалі вельмі жорсткі экзамен. «Нягледзячы на тыя санкцыі, якія былі ўведзены з боку калектыўнага Захаду, у нас не адбылося абвалу эканомікі, — падкрэсліў ён. — І, вядома, прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, якія знаходзяцца ў пастаянным кантакце, урады нашых дзяржаў прымалі ўсе неабходныя меры, каб захаваць работу прамысловых прадпрыемстваў, сельскай гаспадаркі і гэтым самым не дапусціць пагаршэння жыцця людзей».

— Неабходна павышаць эфектыўнасць работы парламента Саюзнай дзяржавы, — рэзюмаваў **старшыня Дзяржаўнай думы Федэральнага сходу Расіі Вячаслаў ВАЛОДЗІН.** — Прыняты шэраг рашэнняў, якія ўпершыню былі разгледжаны і ўжо рэалізаваны з моманту стварэння Парламенцкага сходу. Нам важна, каб структура Парламенцкага сходу была заточана на канчатковы вынік. Створаны камісіі для вырашэння канкрэтных задач. Яны будуць суправаджаць рэалізацыю 28 праграм, прынятых на найвышэйшым узроўні і пытанні быць рэалізаваны ў ходзе работы Парламенцкага сходу разам з выканаўчымі структурамі. Таму ад Парламенцкага сходу ёсць чаканні на большую эфектыўнасць і дынамічнасць у рабоце.

Паводле БелТА.

Грамадзянская супольнасць

«ІДЭІ АБНОЎЛЕНАЙ КАНСТЫТУЦЫІ ПАВІННЫ БЫЦЬ АДЛЮСТРАВАНЫ Ў ПРАГРАМЕ «БЕЛАЙ РУСІ»

Пра гэта заявіў новаабраны старшыня грамадскага аб'яднання Алег РАМАНАЎ на IV з'ездзе

Удзел у мерапрыемстве, якое прайшло ў Прэзідэнт-атэлі ў Мінску, прынялі амаль 500 дэлегатаў з усіх рэгіёнаў.

«Мы ставім перад сабой новыя амбіцыйныя задачы. Яны звязаны з умовамі, якія змяніліся. Па-першае, прынятая абноўленая Канстытуцыя, яе ідэі абавязкова павінны быць адлюстраваны ў новай праграме «Белай Русі», і гэта будзе зроблена. Мы будзем працаваць над дбайным захаваннем гістарычнай памяці і праўды аб подзвігу беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, абаронай традыцыйных каштоўнасцяў, забеспячэннем суверэнітэту нашай краіны ва ўсіх яе сферах: інфармацыйнай, палітычнай, ідэалагічнай, прапагандысцкай», — сказаў Алег Раманаў.

Усе выклікі, якія сёння стаяць перад нашай краінай, паводле яго слоў, будуць задачамі грамадскага аб'яднання, адлюстраванымі ў праграме яе дзейнасці.

Алег Раманаў звярнуў увагу, адказваючы на пытанні журналістаў, што на працягу апошніх пяці гадоў «Белая Русь» рэалізоўвала сваю ідэалогію, якая базіравалася на падтрымцы палітычнага курса Прэзідэнта Беларусі, дзяржаўнай ідэалогіі, рэалізацыі сацыяльна значных праектаў і ініцыятыў. «Гэта ўсё тое, што аб'ядноўвае нашу краіну і дазваляе ёй упэўнена развівацца. Вынікі работы аб'яднання бачныя, яны значныя. Гэта рэалізацыя праектаў, якія пачала «Белая Русь», гуманітарная дапамога, палітычная асвета, работа грамадскіх прыёмных, якія забяспечваюць сувязь грамадзян і дзяржавы. Гэта толькі нямногія напрамкі дзейнасці, якую вяла і вядзе «Белая Русь», — дадаў новы кіраўнік арганізацыі.

Ён таксама адзначыў: пры палітычнай волі кіраўніцтва краіны і народа арганізацыя гатова стаць партыяй.

Удзел у форуме прыняў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА.** У сваім выступленні ён адзначыў, што «Белая Русь» упэўнена займае нішу ў грамадскім жыцці краіны і важна, каб голас аб'яднання гучаў у поўную сілу.

«Так, арганізацыя прайшла выпрабаванне часам за 15 гадоў, але асаблівыя апошнія два гады. Кожны з вас на сабе адчуў, наколькі важна для нас сёння адзінства і праца разам, не падзяляючы задачы на задачы ўлады і грамадскіх структур», — дадаў Ігар Сергеенка.

Ён агучыў свае думкі наконт работы «Белай Русі» на перспектыву. Сярод яго тэзісаў: выбудоўванне дасканалай працы аб'яднання на месцах, устанаўленне арганізацыі як плюралістычнага грамадска-палітычнага дыялогу, інфармацыйна-прапагандысцкая работа, узмацненне прысутнасці ў інтэрнэт-прасторы, выхаванне перспектыўных кіраўнікоў.

«Вопыт «Белай Русі» будзе карысны пры падрыхтоўцы Усебеларускага народнага сходу, Закона аб грамадзянскай супольнасці, над якім ідзе работа. І «Белая Русь» там павінна заняць годнае месца», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

На чарговым з'ездзе арганізацыі абралі новага старшыню (рэктара Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, сенатара Алега Раманава), заслухалі яго даклад аб новай рэдакцыі праграмы «Белай Русі». Выбраны таксама кіруючыя органы — Рэспубліканскі Савет і Цэнтральная кантрольна-рэвізійная камісія.

Марыя ДАДАЛКА.

Супрацоўніцтва

ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЕ, ІНФРАСТРУКТУРА, ЛІЧБАВІЗАЦЫЯ

Пасяджэнне Еўразійскага міжурадавага савета праходзіць 20—21 чэрвеня ў Мінску ў вочным фармаце, паведамілі ў прэс-службе Еўразійскай эканамічнай камісіі.

Кіраўнікі ўрадаў краін ЕАЭС абмяркуюць увядзенне маркіроўкі тавараў сродкамі ідэнтыфікацыі ў ЕАЭС, стварэнне камісіі па кааперацыі і імпартазамяшчэнні ў прыярытэтных і высокатэхналагічных галінах прамысловасці, стан канкурэнцыі на трансгранічных рынках. Акрамя таго, на парадку дня — пытанні развіцця транспартнай інфраструктуры, лічбавізацыі эканомікі, электроннага гандлю, мытнага супрацоўніцтва.

Саюзныя праграмы па інтэграцыі Беларусі і Расіі стане больш. Аб гэтым заявіў **прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА** падчас сустрэчы са старшынёй урада Расіі Міхаілам Мішусціным, перадае карэспандэнт БелТА. «У нас вельмі насычаны двухбаковы парадак дня ў сувязі з неабходнасцю вырашэння востры пытанняў падтрымкі эканомікі ва ўмовах беспрэцэдэнтнага санкцыйнага ціску. Насамрэч гэта эканамічная вайна, якая вядзецца ў дачыненні да Беларусі і Расіі. За нязначныя чатыры месяцы на нацыянальным узроўні ўрадамі нашых краін было зроблена вельмі шмат, каб мінімізаваць наступствы гэтага ціску, згуладзіць узаемныя дзеянні па засваенні імпартазамяшчальнай прадукцыі, адаптацыі эканомік да зменены знешніх умоў, насычэнні спажывецкага рынку, фарміраванні новай лагістыкі і комплексных мер для падтрымкі ўсіх галін, іх у найбліжэйшай будучыні стане больш, мы вядзём работу над гэтым», — сказаў Раман Галоўчанка.

Паводле яго слоў, наладжаны рэгулярныя кантакты паміж вiцэ-прэм'ерамі дзвюх краін, функцыяне група высокага ўзроўню Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы. «Іх работа накіравана на аператыўнае знятце праблемных пытанняў у двухбаковым гандлі. Цяпер на першы план выходзяць каардынацыя і ўзаемная падтрымка па пераадоленні крызісных з'яў», — адзначыў прэм'ер-міністр. «Дзяржаўныя органамі Беларусі і Расіі падрыхтаваны шэраг прапаноў для прыняцця рашэнняў на ўзроўні кіраўнікоў урадаў. Абстаноўка, якая складваецца, дыктуе неабходнасць дзейнічаць хутка і рашуча», — падкрэсліў кіраўнік беларускага ўрада.

Беларусь і Расія выстрымаюць прэсінг заходніх санкцый і стануць мацнейшымі. Аб гэтым заявіў старшыня ўрада Расіі. Нашы краіны змогуць «пераадолець наступствы заходніх санкцый, у тым ліку за кошт паглыблення інтэграцыі ў Саюзнай дзяржаве, запуску сумесных праектаў, развіцця новых вытворчых і лагістычных ланцужкоў», заўважыў Міхаіл Мішусцін. Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва дзвюх краін развіваецца паспяхова. Важную ролю ў развіцці гандлёва-эканамічных сувязяў адыгрывае прамое ўзаемадзеянне рэгіёнаў. «Перакананы, што Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які мае адбыцца, надасць яшчэ больш глыбокі імпульс міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву», — дадаў Міхаіл Мішусцін.

Прэм'ер-міністр Беларусі намеціў напрамкі супрацоўніцтва падчас сустрэчы з прэм'ер-міністрам Узбекістана (краіна мае статус назіральніка ў ЕАЭС) Абдулой Арыпавым, перадае карэспандэнт БелТА. Таксама кіраўнікі ўрадаў наведалі Парк высокіх тэхналогій. Яны азнаёміліся з дзейнасцю парка, прававымі ўмовамі працы ў ПВТ, распрацоўкамі яго рэзідэнтаў. Кіраўнікі ўрадаў Беларусі, Расіі і Узбекістана Раман Галоўчанка, Міхаіл Мішусцін і Абдула Арыпаў наведалі «Амкадор». Прэм'ер-міністры азнаёміліся з работай прадпрыемства і абмеркавалі перспектывы супрацоўніцтва ў прамысловай сферы.

Пётр ДУНЬКО.

Извещение о проведении 12 июля 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
Технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники с инв. № в ЕГРНИ 600/С-162566 общей площадью 9 270,6 кв. м (**назначение:** сооружение специализированное складов, хранилищ; **составные части и принадлежности:** технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники – литер А, состоящая из подъезда, трех покрытий, трех бортов, технологической площадки, дорожки, ограждения)
Сведения о земельном участке: площадь – 1,6243 га, кадастровый номер – 623650100001005212
Местонахождение – Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17
Начальная цена – 583 040,40 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка – 58 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190368533.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **12 июля 2022 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 21.06.2022 по 08.07.2022 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону: (017) 388-43-21.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»;
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Центр Промышленной Оценки • ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ • ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

Извещение о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	ОАО «Минский подшипниковый завод», г. Минск, ул. Жилуновича, 2
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронного аукциона

Незавершенное законсервированное строение – готовность 82 % (назначение: здание незавершенного строительства, об. пл. 857,6 кв. м, инвен. № 500/U-1026105).

Местоположение: **г. Минск, ул. Жилуновича, 2/7**

Сведения о земельном участке: **пл. 36,8556 га,** предоставлен продавцу на праве долевой аренды (доля: 89/100, срок действия по 31.07.2053) для размещения объектов иного назначения. Ограничения (обременения): охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5060 га), теплоснабжения (пл. 0,2500 га), газоснабжения (пл. 0,0430 га). После продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута.

Начальная цена лота с НДС 20 % – 931 127,92 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи:
10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнуто договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 3 % от цены продажи предмета электронных торгов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов – 22.07.2022 в 11.00.** **Окончание торгов – 22.07.2022 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 21.07.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**
Контактные телефоны	**+ 375 (17) 280 36 37; + 375 (29) 317 95 42,** **E-mail: info@ipmtorgi.by**

ЗАО «БелБанкротАукцион».

организатор торгов по продаже имущества **СП ООО «Унибокс»** (УНП 101449345), объявляет о проведении **06.07.2022 г.** в 10.00 публичных торгов по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501.

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrotstvo.by/wp-content/uploads/2022/06/spisok-imushhestva-uniboks-06.07.22.pdf

Продавец: СП ООО «Унибокс».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского д. 226, ком. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо внести задаток – размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **05.07.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933 в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **21.06.2022** по 17.00 **05.07.2022** по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501. К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 360,80 бел. руб; стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре. Срок подписания договора купли-продажи: в течение 5 календарных рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 15 календарных дней с даты проведения торгов.

Извещение о проведении 05 июля 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белстройматериалы»

Предмет торгов
Изолированное помещение с инв. № в ЕГРНИ 500/D-7114724 общей площадью 257,5 кв. м (наименование: помещение неустановленного назначения; назначение: помещение неустановленного назначения)
Местонахождение: г. Минск, ул. Бабушкина, 48-1
Начальная цена: 88 128,00 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 8 800,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «Белстройматериалы», пр-т Партизанский, 99а, 220021, г. Минск, тел. (017) 342-71-92.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 363-25-62.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя платежа – 190368533.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа на срок до 4 месяцев после заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся 05 июля 2022 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 21.06.2022 по 01.07.2022 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефонам: (017) 272-55-57, (029) 302-68-86.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»; (017) 240-35-94, (044) 766-47-47 (ОАО «Белстройматериалы»).

Информация о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

Номер лота. Местонахождение земельного участка	Площадь, га	Кадастровый номер	Целевое назначение Земельного участка	Начальная цена, рублей
Лот № 1 д. Абрамы	0,0982	624083390501000028	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения (размещения объектов усадебной застройки (строительство и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	2000
Лот № 2 д.Тюкши	0,1104	624083317601000023	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения (размещения объектов усадебной застройки (строительство и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	6000
Дата, время и место проведения аукциона	28 июля 2022 г. в 11.00 ар. Нарочь, ул. Первомайская, д. 49 (зал заседаний), Нарочский сельский исполнительный комитет			
Извещение опубликовано	Официальный сайт Минского облисполкома www.minsk-region.gov.by (http://minsk-region.gov.by/ekonomika-i-finansy/zemelnye-uchastki-01/zemelnye-uchastki-v-chastnuuyu-sobstvennost-01/) Официальный сайт Государственного комитета по имуществу gki.gov.by (https://au.nca.by/search) Официальный сайт Мядельского райисполкома http://myadel.gov.by/ru/stormirovan-ru/			

УНП 300042199

Ид 600007530

ОАО «Нафтан» реализует на конкурсной основе (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество

Пометка на конверте	Наименование	Инв. №	Год ввода в эксплуатацию	Начальная цена без НДС, руб. РБ	Начальная цена с НДС, руб. РБ
Реализация неликвидов, Нафтан, 21.07.2022	Балансировочный стенд-6-105 Ravaglioli s.p.a.G 105C	06152549	1994	606,00	727,20
	Автомобиль грузовой специальный «Мусоровоз» Зил 433362 ММК-2	13150582	2009	8 937,50	10 725,00
	Машина маркировочная ММ-4М	06270701	2007	902,00	1082,40
Реализация неликвидов, Полимир, 21.07.2022	Резательная машина	195111	2004	645,60	774,72
	Резательная машина	195112	2004	645,60	774,72
	Резательная машина MPB-100	195349	2005	2604,80	3125,76

Состояние удовлетворительное.

Предложения принимаются по адресу: 211441, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 21 июля 2022 года с пометками на конверте, указанными в таблице, либо в электронной форме на e-mail: tender.box@naftan.by с вышеуказанными пометками.

Извещения на проведение конкурсов размещены на сайте www.naftan.by.

Контактные телефоны: 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42.

РАМАНТАВАЦЬ АБО ЗНОСІЦЬ?

Парушэнні ў тэрмінах і планаванні

Беларусы вельмі востра адчуваюць праблему капрамонту і гэтак жа на яе рэагуюць — 45 % зваротаў грамадзян датычыцца менавіта ўтрымання і капітальнага рамонту жылфонду. Мы павінны разабрацца, што перашкаджае выйсці на ўстаноўленыя паказчыкі, як паскорыць і спрасціць работу па капрамонце, не забываючы пра яе якасць, лічыць **міністр ЖКГ Андрэй ХМЕЛЬ.**

Згодна з дзяржаўнай праграмай «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2021—2025 гг. і іншымі дакументамі, сёлета ў краіне трэба капітальна адрамантаваць 3 млн 620 тыс. м² жылля, на што з бюджэту прадугледжана 386,99 млн рублёў. А з улікам адлічэнняў, якія паступілі на капрамонт ад насельніцтва, агульны аб'ём грошай — 714,6 млн рублёў. Пры гэтым на 1 мая аб'ём сродкаў на капрамонт быў павялічаны па ўсіх абласцях і сталіцы, а ў Мінскай вобласці зменшаны на 3,253 млн рублёў, расказаў **Андрэй РАМАШКА, начальнік управлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ:**

— У бягучыя графікі капрамонту ўключана 1295 аб'ектаў агульнай плошчай 3 млн 995 тыс. м², што з запасам забяспечвае выкананне гадавога паказчыка. Вызначаны пакварталыныя паказчыкі выканання капрамонту, і ўжо ўведзена ў эксплуатацыю больш як 260 тыс. м². Разам з тым, згодна з інфармацыяй, прадстаўленай абласнымі ўпраўленнямі ЖКГ, і аб'ёмамі фінансавання, рэалізаваць капрамонт сёлета можна будзе толькі на 85 % (3 млн 100 тыс. м²). Аб'ём гадавога задання па капрамонце пакуль выкананы крыху больш як на 7 %.

Абазначыў намеснік міністра і праблему перавышэння тэрмінаў. На пачатак 2022-га ў Беларусі было 214 аб'ектаў з перавышанымі нарматыўнымі тэрмінамі будаўніцтва. Цяпер такіх аб'ектаў 141, з іх 97 — у сталіцы. Вясной колькасць аб'ектаў за звышнарматыўным перавышэннем тэрміну зменшылася на дзесяць, адна за гэты год такіх аб'ектаў ужо пабольшала з 18 да 35.

У першым квартале 2022-га Дзяржбудінаглядам было праверана больш за тысячу аб'ектаў капрамонту, дзе выяўлена 11 669 дэфектаў і парушэнняў на 496 аб'ектах. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 237 фізічных і юрыдычных асоб, з якіх спагнана 20,5 тысячы рублёў штрафу, вынесена 87 папярэджанняў.

— Найбольш характэрныя парушэнні падчас капрамонту: арганізацыя будаўнічай выторвчасці, аўтарскі тэхнічны нагляд у будаўніцтве. Гэта сведчыць пра неналежную арганізацыю капрамонту не толькі пры яго планаванні, але і на стадыі будаўніча-мантажных работ, — адзначыў Андрэй Рамашка.

Прычына многіх праблем капрамонту вынікае з таго, што пры яго правядзенні неналежным чынам арганізавана работа на самым пачатку, лічыць міністр:

— Грамадзяне ў зваротах кажуць, што не ведаюць, што адбываецца. Іх просьбу даць допуск у кватэры наведаваў дзеля чаго. Сходы не праводзіліся, аб'ёмы капрамонту не даведзены, дагаворы з імі не заключаны. Такая сітуацыя існуе ў Мінскім раёне.

Што датычыцца недахопу сродкаў на капрамонт і росту коштУ матэрыялаў, то трэба глядзець, на колькі і што падаражэла, а што стала танней, і прыводзіць дадатковыя і абгрунтаваныя прычыны, чаму не вытрымліваюцца тэрміны, дадаў Андрэй Хмель.

Эканамічна немэтазгодны капрамонт

Камунальнікі Мінскай вобласці прапануюць знесці 14 малапавярховых дамоў 1953 года пабудовы ў г. п. Мачулішчы і пабудаваць на іх месцы восем жылых дамоў сярэдняй паверхавасці. Такім чынам, замест 216 кватэр, якія мяркуецца зруйнаваць, будзе збудавана 440 кватэр, частку якіх зойміць былыя гаспадары знесеных жылля. А частку — грамадзяне, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у тым ліку шматдзетныя. Разам з гэтым абновіцца жылфонд, зменшацца эксплуатацыйныя расходы, зменіцца аблічча населеных пунктаў, упэўнены яны.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На абслугоўванні ЖКГ Мінскай вобласці 8713 дамоў плошчай 14 млн 200 тыс. м², капітальна адрамантавана 1128 з іх (18 % ад агульнай колькасці). Архітэктурная асаблівасць вобласці ў тым, што вышэй за пяць паверхаў тут толькі 8,1 % жылфонду, а 53 % (4650 будынкаў) — адна- і двухпавярховікі, 34 % з якіх эксплуатуюцца больш за 60 гадоў. Вядома, што яны маюць высокую фізічную і маральную зношанасць і пры складанні праектна-каштарыснай дакументацыі маюць высокі кошт капрамонту. І гэта тое, што найперш хвалюе камунальнікаў Міншчыны, расказала **Святлана ВАЛЬКО, намеснік гендырэктара ЖКГ Мінскай вобласці:**

— У нас шмат двухпавярховых жылых дамоў. Напрыклад, васьмікватэрны двухпавярховы дом у г. п. Мачулішчы 1951 года пабудовы агульнай плошчай 583 м². Каштарысны кошт на капрамонт будынка, якім прадугледжана практычна ўсё, што можна зрабіць падчас капрамонту, — 290 тысяч, а кошт метра квадратнага — 566 рублёў. Падобных дамоў шмат, і многія з іх не маюць цэнтральнай каналізацыі ці гарачага водазабеспячэння. Таму замест капрамонту мы хацелі б прапанаваць рэнавацыю такога жылля. Мы разлічылі прыкладны кошт затрат з улікам зносу будынкаў, кампенсацыйных выплат і будаўніцтва новага жылля прыкладна той жа квадратуры.

Калі жыхары бачаць, што нешта няякасна робіцца падчас рамонту ці пасля яго, то са скаргай трэба звяртацца ў службу 115 у межах гарантыйных тэрмінаў. Пытанне перададуць упаўнаважанай асобе, якая арганізуе выезд на рамонт, і ўжо яна прымусіць падрадчыка выправіць сітуацыю. І гэта працуе. Людзі павінны ведаць упаўнаважаную асобу ў твар, каб яна мела з імі настолькі шчыльныя стасункі, каб праблемныя пытанні можна было вырашаць дарэчы, без зваротаў у 115. Што датычыцца часу капрамонту, то яго трэба чакаць. Рана ці позна ён прыйдзе ў кожны дом у краіне, запэўніў міністр.

засталося да аварыйнага, але яно падлягае капрамонту, людзі атрымлівалі ва ўласнасць нанова збудаваныя кватэры. Такім прыкладам можна стварыць прэцэдэнт у краіне, і людзі будуць патрабаваць знос замест капрамонту. Перш чым будзе прынятае рашэнне па гэтых дамах, яго трэба ўзважыць.

Рашэнне фінансавай праблемы камунальнікі Міншчыны бачаць у прыходзе інвестара і просяць падтрымаць гэтую ідэю.

— У сталіцы ўжо даўно прынята рашэнне, што двухпавярховікі капітальна не рэканструююць. Пытанне ў тым, што сёння ўласнік тэрыторыі павінен прыняць

рашэнне. Заканадаўствам прапісана: калі відаць, што перспектывы ніякай няма, не будзе ніякіх інвестыцый, а дом трэба рамантаваць, то прымаецца рашэнне аблыквакнкама і выкананецца рамонт. Калі ж хоць бы мінімальная перспектыва ёсць, што ў Мачулішчы прыйдуць людзі, што там ёсць выторчасць, то рашэнне можа быць іншае, а тэрыторыя — разглядацца як інвестучастак, — удакладніў **першы намеснік міністра Генадзь ТРУБІЛА.**

Прапануюць камунальнікі таксама праводзіць уцяпленне дамоў за сродкі грамадзян, што дазволіць сэканоміць бюджэт. А некаторыя спецыялісты ўвогуле лічаць, што ўласнікі павінны за ўсе работы, у тым ліку і за капрамонт, плаціць са сваёй кішэні.

З тым, што капрамонт павінен аплачвацца насельніцтвам напоўніцу, а не як сёння, на 40 %, згодзен і міністр, аднак ісці да гэтага трэба паэтапна, крокава, упэўнены ён. Большасць людзей сёння не пацягнуць капрамонт сваімі сіламі, тым больш што ў беларусаў дагэтуль не сфарміравана панятце і разуменне інструтута ўласнасці.

Доход выплачивается периодически, в даты выплаты дохода, на основании реестра владельцев облигаций, сформированного депозитарием Эмитента для целей выплаты дохода.

Сумма дохода перечисляется владельцам облигаций в безналичном порядке в соответствии с законодательством на счета владельцев облигаций. Округление полученных значений осуществляется по каждой облигации в соответствии с правилами математического округления с точностью до целой белорусской копейки.

В случае отсутствия в реестре владельцев Облигаций данных о счетах владельцев облигаций и (или) если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, подлежащая к выплате сумма денежных средств выплачивается после письменного обращения владельца облигаций к Эмитенту по адресу местонахождения Эмитента.

В случае если дата выплаты дохода выпадает на нерабочий день, фактическая выплата дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. При этом количество календарных дней в соответствующем периоде начисления дохода остается неизменным.

В случае если дата формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты дохода выпадает на нерабочий день, формирование реестра осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем.

Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гроднопромстрой» в г. Гродно 12 июля 2022 года

Вид аукциона открытый	Лот № 1
Предмет аукциона (Объект)	Имущество, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 440100000001002874 по пер. Победы, д. 11 площадью 1,41 га (имущественное право земельного участка – право постоянного пользования): **капитальное строение с инв. № 400/С-163556** (здание асфальтного участка с весовой) площадью 318,8 кв. м, составные части и принадлежности: ограждение, асфальтобетонная площадка, подпорная стена); **капитальное строение с инв. № 400/С-163557** (автомастерская) площадью 257 кв.м, составные части и принадлежности: пристройка; **капитальное строение с инв. № 400/С-163555** (спецгарная и столярная мастерская) площадью 143 кв. м; **капитальное строение с инв. № 400/С-163558** (склад битума 1) площадью 27 кв. м; **капитальное строение с инв. № 400/С-67411** (котельная) площадью 99,6 кв. м; **капитальное строение с инв. № 400/С-163848** (газопроводная сеть) протяженностью 129,9 м; **капитальное строение с инв. № 400/С-163847** (газопроводная сеть) протяженностью 32,6 м; **27 единиц оборудования**
Продавец	Открытое акционерное общество «Гроднопромстрой», г. Гродно, пр-т Космонавтов, 52, тел.: 8 (0152) 719739, 744107
Начальная цена продажи	755 047,68 рубля (с учетом НДС 20 %)
Сумма задатка	75 000,00 рубля

Организатор аукциона: **Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 626055, 626056**

Дата проведения аукциона: **12 июля 2022 года**

Время проведения аукциона: 12.00

Место проведения аукциона: **г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, актовый зал**

Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов: **г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет № 117**

Дата и время начала приема документов: **22 июня 2022 года 8.00**

Дата и время окончания приема документов: **6 июля 2022 года 17.00**

Объект обременен договором аренды сроком до 30.06.2022. Земельный участок и капитальные строения расположены на территории, предусмотренной под производственную застройку.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона 5 %.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений об оплате задатка на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»; **гражданином**: копия документа, содержащего его идентификационные сведения; **индивидуальным предпринимателем**: копии свидетельства о государственной регистрации ИП; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя**: нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица РБ**: доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юр. лица, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. Граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юр. лиц, уполномоченные должностные лица юр. лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность. Уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные гражданами, ИП, юр. лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Торги в отношении предмета аукциона проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней после проведения аукционных торгов. Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Извещение вместе с перечнем предлагаемого к продаже оборудования опубликовано на сайте: коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»: http://gcn.by; Гродненский городской исполнительный комитет: http://grodno.gov.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении аукциона

ЛОТ 1: капитальное строение, инвентарный номер № 412/С26987 (назначение: здание специализированное растениеводства, наименование: здание сарая под агрегатом АВМ-0,4), общей площадью 491,3 кв. м, составные части и принадлежности: Б1/к-пристройка), расположенное по адресу: Мостовский район, Дубненский с/с, 26/2, около д. Русиновцы.

ЛОТ 1: расположен на земельном участке кадастровым номером 424081700001000484 площадью 0,0911 га (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания сарая под агрегатом АВМ-0,4, находящегося по адресу: Мостовский район, Дубненский с/с, 26/2, около д. Русиновцы. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании: земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов) площадь – 0,0855 га.

Начальная цена продажи – 11 880 руб. (одиннадцать тысяч восемьсот восемьдесят рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 188 руб. (одна тысяча сто восемьдесят восемь рублей).

Условия аукциона:

- условия оплаты – рассрочка на 3 месяца с даты заключения договора;
- обязанности подписания и подачи в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» заявление о государственной регистрации и документов, необходимых для осуществления государственной регистрации договора купли-продажи, и основанного на нем права собственности на капитальное строение возлагается на покупателя;
- расходы по удостоверению договора купли-продажи капитального строения в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» возлагаются на покупателя

Продавец – ОАО «Агрокомбинат «Скидельский», Филиал «Дубно», 231602, Мостовский р-н, а. г. Дубно, ул. Октябрьская, 8, тел. 8-01515-606-68

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500803225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 22 июля 2022 г. в 11.00

по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона (https://grino.by/aukcion/

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.

Последний день приема заявлений – 20 июля 2022 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion

Дзейныя асобы

ЯК ТЫ ДА ЛЮДЗЕЙ, ТАК І ЛЮДЗІ ДА ЦЯБЕ

Слыннай беларускай журналістцы Марыі Карпенцы сёлета споўнілася б 90 гадоў

У Год гістарычнай памяці, здаецца, будзе карысным згадаць і тых, хто шмат зрабіў для нашай краіны, хто жыў, працаваў побач з намі, з кім мы стасаваліся, супрацоўнічалі, сябравалі.

Гэта я наконт таго, што мне пашчасціла быць знаёмым з сям'ёй Карпенкаў. З Мікалаем Сяргеевічам я працаваў у аддзеле культуры ЦК КПБ на пачатку 1980-х. Я, не меўшы да ЦК вопыту партыйнай працы, нават нізавол, уважліва прыглядаўся да таго, як паводзяць сябе мае калегі, прыслухоўваўся да іх парад. Прайда, не мелі такога вопыту ні Мікалай Карпенка, ні Уладзімір Гілеп. Але вучыцца разам было лягчэй, тым больш што яны ўжо пэўны час спасцігалі таямніцы цэкоўскай атмасферы. Вучыліся і спосабам працы, і як зносіцца з людзьмі, якія часта звярталіся ў самую высокую на той час інстанцыю: не толькі партыйную, але і жыццёвую, амаль што дзяржаўную, да якой залежалі якасць і смест жыцця многіх і нават іх лёс. А маімі калегамі тады былі Іван Пашкевіч, Іван Вашкевіч, Мікалай Карпенка, Сяргей Законнікаў, Расціслаў Бузук, Уладзімір Гілеп, Марыя Крыловіч, Вячаслаў Высэўка, Генадзь Пашкоў, Іван Рай, Паўла Пятроўна Украінец (намеснік загадчыка аддзела), загадчыкам спачатку быў Іван Іванавіч Антановіч, а пасля Яўген Канстанцінавіч Вайтовіч.

Згадак самай рознай якасці і зместу з той пары засталося шмат. І найперш правіла, якое я засвоіў, заключаецца ў наступнай фразе: рабі людзям тое, што хочаш, каб яны рабілі табе. Або, калі прадоўжыць: як ты да людзей сёння, так яны да цябе заўтра. Мае калегі стараліся як мага больш дакладна трымацца гэтага правіла, асабліва тыя, хто меў практыку непасрэднай работы ў непартыйных калектывах.

З Мікалаем Сяргеевічам мы не толькі разам працавалі, але так сталася, што і жылі ў суседніх дамах. Таму стасаваліся часта, вялі гаворку не толькі пра работу. Здаралася, я сустракаў на вуліцы і яго жонку Марыю Іосіфаўну. Яна была галоўным рэдактарам часопіса «Работніца і сялянка» (пазней «Алеся»). У свой час у Мінску заўважылі здольнасці супрацоўніцы «Магілёўскай праўды», прапанавалі пераехаць у сталіцу. І не памыліліся. Марыя Іосіфаўна цалкам апраўдала гэткі давер. З ёй пераехаў у Мінск і Мікалай Сяргеевіч, атрымаў пасаду ў ЦК КПБ.

Амаль на 30 гадоў звязала «Работніца і сялянка» Марыю Іосіфаўну з рэдактарскай працай. Усімі выданнямі, у тым ліку і гэтым, тады заклапочана апекаваўся ЦК КПБ. Праз гэта Марыя Карпенка мела зносіны не толькі з шараговымі супрацоўнікамі ЦК, але і з самім Першым сакратаром П. М. Машэравым. Ён пераважна і шанаваў журналісцкі талент і жыццёвы вопыт Марыі Іосіфаўны. Іначай не стала б яна самай вядомай журналісткай не толькі ў Беларусі. Пра тое сведчаць хоць бы многія высокія грамадскія пасады, якія займала Марыя Іосіфаўна.

Няпросты гэта, скажу вам, быў рэдактарскі надзел. Колькі творчых сіл трэба было мець і дбайна выдаткоўваць, добра ведала толькі яна. Але ж вынікі былі відавочныя: хто б мог падумаць, што часопіс на беларускай мове, які да гэтага не вызначаўся асаблівай папулярнасцю нават у Беларусі, уздымецца на недасягальную для іншых вышыню, стане запатрабаваным ва ўсім Савецкім Саюзе. Вы не паверыце, але яго тыраж пры Марыі Карпенцы складаў паўтара мільёна экземпляраў! Неверагодна, аднак факт. І цяпер можаце ўявіць, які змест, якія публікацыі мусілі быць на старонках часопіса, каб ім так цікавілося, каб яго так чыталі. Мо і праз гэта Марыя Іосіфаўна стала нібыта жаночым сімвалам Беларусі, вядомай не толькі ў нашых гарадах і вёсках, але і далёка за ўнікмі межамі — па ўсім Савецкім Саюзе. Яе нездарма называлі легендай беларускай журналістыкі, двойчы ўключалі ў склад дэлегацыі на Генеральнай сесіі ААН у Нью-Ёрку.

А яшчэ ж — колькі было яе публікацый у розных калектыўных зборніках, колькі кніг публіцыстыкі, а колькі добрых спраў для людзей за яе амаль 89 гадоў жыцця!

Прызнаюся, што і я быў асмялёў і прапанаваў часопісу некаторыя свае творы. Найперш казкі для дзяцей, у рубрыку «Мама, пачытай!» У дзявятым нумары за 1985 год была надрукаваная мая казка «Надзейка-чарадзейка». Але тым часам я карыстаўся псеўданімам Максім Валошка, бо займаў пасаду ў ЦК КПБ і не хацеў, каб маё друкаванне і творчыя набыткі былі пазначаны хоць кропляй неадпаведнага літаратурнай вартасці спрыяння.

І вось адной раніцай сустракаю на вуліцы Марыю Іосіфаўну. Шчыра дзякую ёй за надрукаваную казку. «Якую?» — пытаецца яна. Адказваю. «Дык гэта ж не твая, там жа аўтар Валошка». — «А я і ёсць Валошка». — «Чаму ж не сказаў мне раней?» — «Не лічыў патрэбным», — адказваю я. «Ну і дарэмна, — нечакана перапыняе мяне Марыя Іосіфаўна. — Мы і ганарар большы б выпісалі». Я апраўдваюся, што акурат таму і не сказаў і не падпісаўся сапраўдным прозвішчам, каб не было залішне «сяброўскіх» адносін.

Натуральная чалавечая ўзаемапавага існавала паміж намі ўсё жыццё. Колькі цікавых гутарак і нават спрэчак было з Марыяй Іосіфаўнай, колькі перагаворана на тэму паляпшэння журналісцкай працы і спрыяння творчым людзям, падтрымкі перыядычных выданняў. Бо з развалам Савецкага Саюза тыраж «Алеся» (былой «Работніцы і сялянкі»), як і многіх іншых газетных («неверагодна вялікі — больш за мільён экзэмпляраў — мела газета «Знамя юности», рэдактарам якой быў Мікалай Сакалоў) і часопісных выданняў, непамерна скарацішся, стала цяжка выжывацъ. Але Марыя Іосіфаўна старалася ўсё рабіць дзеля таго, каб часопіс жыў і быў запатрабаваны ў чытачоў, галоўнай прыкметай чаго з'яўлялася падпіска. Ёй гэта ўдавалася.

Не адважуся сказаць, што мы сябравалі, але прыязныя адносіны склаліся адразу — нармальныя, зацікаўленыя. І нават пасля сыходу з працы яна ніколі не губляла настрою, заўсёды сустракала з усмешкай, вабнай дабрынёй свяціліся яе вочы. А пры сустрэчы мы маглі прастаяць на вуліцы і прагаварыць не адзін дзясятак хвілін. Яе па-ранейшаму цікавіла ўсё, што адбываецца вакол (і не толькі) і чаго яна мо не паспела зведаць. Дасведчанай была заўсёды і ў многіх сферах, нездарма ж мела званне заслужанага работніка культуры. А што да грамадскіх спраў, то і пералічыць іх складана — не хопіць газетнай плошчы. Ад адной са стваральніц Беларускага саюза журналістаў да народнага дэпутата СССР. І я заўсёды заўважаў, што да сваіх абавязкаў ставілася надзвычай сур'ёзна, не шкадавала ні сіл, ні часу. Таму і вынікі мела станоўчыя. Яе паважалі, спадзяваліся на падтрымку і дапамогу. У большасці выпадкаў атрымлівалі чаканае, інакш Марыя Іосіфаўна не магла. А мо і не хацела. Чым не вабны прыклад, як трэба жыць і працаваць? Але ж найперш — жыць па прынцыпе: як ты да людзей, так і людзі да цябе.

Я мог бы яшчэ шмат чаго добрага сказаць на адрас Марыі Карпенкі. Прызнаюся, што мяне на гэтае слова навёў адзін яе ліст, які захоўваю і сёння. Тады я працаваў першым Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Румыніі. Але нашы сувязі не перапыняліся, мы віншаваліся, часам ліставаліся. І вось Марыя Іосіфаўна піша:

«Дзень добры, шаноўнай Анатоль Іванавіч, Тася (мая жонка, з якой Марыя Іосіфаўна аказвотна стасавалася. — **А.Б.**) і Надзя (мая дачка, яны абедзве былі са мной у Бухарэсце. — **А. Б.**)! Вялікі дзякуй за пісьмо, якое мы ў рэдакцыі атрымалі з месяц назад, а адказ я пішу толькі цяпер, таму што была ў «Соснах» на Нарачы. Даруйце за затрымку.

Перш за ўсё віншуем усіх вас з надыходзячым Новым годам! Няхай ён прыняе вам толькі дабро і здароўе.

Паважаны Анатоль Іванавіч! Старонка «Мама, пачытай!» у нас захавалася, і дасланы Вамі твор мы маем намер даць у другі і трэці нумар за будучы год (калі не загінем ад усіх гэтых крызісаў, інфляцый і г. д.). Пакуль яшчэ ідзе падпіска, то нават не ведаем, колькі чытачоў у нас застанецца, бо часопіс падаражэў удвая і настолькі ж збяднелі людзі. Але на нешта спадзяёмся.

Крыху пра свае асабістыя справы. Як бачыце, яшчэ працую, кантракт і са мной, і з В. Блакітам (Валянцін Блакіт, сапраўднае прозвішча Валянцін Болтач — галоўны рэдактар часопіса «Вожык». — **А.Б.**) заключылі да лістапада будучага года. Пасля таго, як пахавала Мікалая Сяргеевіча (ён памёр раптоўна 20 лютага г.г. у Цімкавічах, дзе мая радзіма), на многае гляджу зусім інакш і ўся жыццёвая мітусня здаецца такой недарэчнай. Вельмі цяжка застацца адной на скіле жыцця. У дзяцей — свае сем'і, свае праблемы. Дзякуй Богу, што ёсць у іх праца і сякія-такія грошы. Жыву з сям'ёй сына, і гэта ратуе ад поўнай адзіноты.

Вельмі рада, што ў вас усё добра, што ў душы дыплімата жыве літаратар. Жадаю Вам вялікіх поспехаў і ў тым, і ў другім.

З павагай і удзячнасцю за ўсё, Марыя Карпенка.

г.Мінск, 15.XII — 98 г.»

Дзякуй вам, шаноўныя Карпенкі — Мікалай Сяргеевіч і Марыя Іосіфаўна, за нашы прыязныя шматгадовыя стасункі, за светласць вашых вачэй, за душэўную шчодрасць у зносінах з людзьмі. Як вы да людзей — так і людзі да вас. І некалі, і сёння.

Анатоль БУТЭВІЧ.

СПРАВА ЖЫЦЦЯ

Вера ЦЕРАХАВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пры раскопках у зямлі знайшлі рэшткі зброі, посуду, прылад працы яшчэ тых людзей, якія называліся плямёнамі дрыгавічоў. Нешта з гэтага выстаўлена ў самым пачатку экспазіцыі. Пазнейшыя раздзелы расказваюць пра вайну 1812 года, якая жорстка прайшлася па гэтай зямлі. Музейная экспазіцыя стваралася па прынцыпе паказу гістарычных падзей праз лёсы землякоў. На кожны перыяд альбо падзею знойдзены ўдзельнікі альбо сведкі з Магілёўшчы, Лыскава, Асошніка і іншых навакольных вёсак Ружаншчыны. Пра вайну 1812 года ўжо сказана, магілевяцкія рупліўцы знайшлі таксама сведчанні пра паўстанцаў Кастуся Каліноўскага, удзельнікаў руска-японскай вайны, рэвалюцыі 1917 года. На адным са стэндаў размешчаны партрэт Канстанціна Бакуновіча, які ў кастрычніку 1917-га служыў на крэйсеры «Аўрора».

Вялікая частка экспазіцыі прысвечана польскаму перыяду гісторыі краю. Асобны стэнд адведзены актывістам КПЗБ і вязням вядомага канцлагера ў Бярозе-Картузскай. Прадстаўлена нават роба вязня бяроза-картузскага лагера з грубай мешкавіны. Некалькі тутэйшых падпольшчыкаў у розны час траплялі ў гэты лагер. Цікавым наведвальнікам падаецца нагрудны знак солтыса польскага часу, які захаваўся ў некага на гарышчы. Ёсць газеты, датаваныя 1920 годам, і арыгінальнае палотніўка чырвонага сцяга КПЗБ.

Асобны раздзел прысвячаецца асобе і творчасці польскага паэта Францішка Карпінскага, родапачынальніка сентыментальнай польскай літаратуры, які жыў у гэтых мясцінах апошнія сорак 30 гадоў і пахаваны ў Лыскаве.

Ідэалы па раздзелах музея, нібы па дзесяцігоддзях гісторыі: у канцы 1939-х – 1940-х была спроба стварэння сельскагаспадарчых арцеляў. Кожная вёска станавілася асобным калгасам, але першы блін аказаўся камяком, і пра гэты кароткі адрэзак «біяграфіі» паселішчаў знайшліся рэальныя сведчанні і успаміны людзей.

Здымак радавога Пятрова

Самая аб'ёмная частка экспазіцыі прысвечана Вялікай Айчыннай вайне. «У Веры Віктаравны быў асаблівы талент здабываць арыгінальныя экспанаты, — расказвае цяперашні **захавальнік музея настаўнік Аляксандр ПАПКО.** — Для вясковага музея пахваліцца сапраўднай папахай і іншымі асабістымі рэчамі генерала Фралянкова, які вызваляў гэтыя мясціны ў 1944-м, — асаблівы гонар. І ў нас гэта ёсць».

Аднак да вызвалення былі тры страшныя гады акупацыі. Аляксандр Сцяпанавіч паказвае нямецкія пашпарты — аўсвайсы, якія атрымалі жыхары вёсак. Новая ўлада правяла такім чынам «інвентарызацыю» насельніцтва. Былі выяўлены савецкія актывісты, тыя, хто падтрымаў саветы, іх лёс аказаўся трагічны. З партрэта глядзіць маладая прыгожая жанчына. Аказваецца, яе расстралялі разам з малым сыночкам у ліку 68 актывістаў і партызанскіх сувязных.

— Расстрэл адбыўся каля вёскі Лыскава, — гаворыць настаўнік. — Але звесткі прыблізныя, насамрэч ахвяр можа быць значна больш. Падпольшчыкаў, людзей, звязаных з партызанамі, выяўляні ўвесь перыяд акупацыі і расстрэльвалі.

Удзельнікі вайны прадстаўлены не толькі ў фотаздымках і кароткіх біяграфічных звестках. Ёсць цэлая калекцыя пісьмаў з вайны, дакументаў, рэчаў франтавікоў, якія цяпер выглядаюць сапраўднымі рэліквіямі.

— Наведвальнікам, экскурсантам, старшакласнікам падчас урокаў нярэдка тлумачу сутнасць вайны на прыкладзе двух здымкаў аднаго і таго ж чалавека, — расказвае Аляксандр Папко. — Яўген Аляксеевіч Пятроў, наш зямляк, удзельнік Сталінградскай бітвы. Паміж здымкамі розніца ў год, той год, які ўмясціў у сябе крывавыя баі пад Сталінградам і лячэнне пасля цяжкіх раненняў. На першым фота ён юны, дваццацігадовы, прыгожы, з другога — глядзіць нібы сарака-гадовы чалавек з пяцігадовымі рэвалюцыямі

У Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук штогод праходзіць міжнародная канферэнцыя «Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі». Даследчыкі распавядаюць пра вынікі сваёй дзейнасці, знаходкі, згадваюць працы папярэднікаў, уздымаюць актуальныя пытанні, звязаныя з вывучэннем гісторыі.
Наш карэспандэнт пабывала на гэтым форуме археолагаў і сабрала самыя цікавыя моманты.

Гістарычная навука

НОВЫЯ ЗАГАДКІ ДЛЯ АРХЕОЛАГАЎ

МІФЫ ЮРАВІЧ

Галоўны навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі Алена КАЛЕЧЫЦ распавяла пра першабытную стаянку Юравічы. Сёння пра яе ведае кожны школьнік, у падручніках пазначана, што гэта найстаражытнейшая стаянка чалавека, знойдзеная на тэрыторыі Беларусі. Апошнія пяць гадоў вывучэнню гэтых мясцін даследчыкі ўдзяляюць асаблівую ўвагу, рыхтуецца кніга пра міфы і рэаліі помніка. Трэба сказаць, што даследаванні ў Юравічах вядуцца ўжо каля ста гадоў. Калі не так даўно даследчыкі тут выявілі гарызонт з косткамі мамантаў. У найбліжэйшай вёсцы пазачыняліся магазіны, усё насельніцтва бегла падзівіцца на цікавостку, і нават старэнькая бабулька караскалася на схіле і запэўнівала, што не памрэ, пакуль не пабачыць маманта. Цяжка паверыць, што яшчэ дваццаць гадоў назад тут было занядбанае месца. Цяпер на ўзгорку стаіць музей, і сюды зачасціл турысты.

Адкапаныя скарэсты падкінулі вучоным багата загадак. Чаму было знойдзена столькі костак у адным месцы? Звесткі па косткам зусім не супадалі з інфармацыяй, якая «счытвалася» са знойдзенага інвентару першабытных людзей. Але наўрад не стаіць на месцы. Магчыма, у тэорыі «мамантавых могільнікаў» можна знайсці патрэбныя падказкі. Відавочна, што старажытныя жывёлы загінулі ў выніку прыродных катастрофы. Падобныя мамантавыя могільнікі адкрываюцца ў розных месцах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

ЮБІЛЕЙ УНІКАЛЬНАГА МУЗЕЯ

Сёлета споўнілася 40 гадоў з адкрыцця адзінага ў свеце музея старажытнай драўлянай архітэктуры «Бярэсце». Доўгі час аб знаходжанні старажытнага горада не было вядома, толькі дзякуючы даследаванням на той час яшчэ аспіранта Пятра Лысенкі гарадзішча было знойдзена. У 1964 годзе ён дасылае даследаванне свайму кіраўніку, і ў хуткім часе выходзіць артыкул з сенсацыяй. Праца маладога даследчыка была сапраўдным навуковым адкрыццём. З 1968-га да 1981 года вялося археалагічныя даследаванні. Былі ўскрыты дзве вуліцы, 223 пабудовы. Такой захаванасці не ведае ні адзін горад. Напрыклад, у старажытным Вялікім Ноўгарадзе захаванасць пабудоў максімальна 2-3 вянцы. У Бярэсці — 10-13 вянцоў пабудовы XIII стагоддзя. Было прынята рашэнне аб стварэнні музея, каб зберагчы такую ўнікальную знаходку. На той час у свеце яшчэ не было практыкі па захаванні такіх вялікіх пабудоў, кансервавалі толькі малыя формы. Шмат намаганняў Пятру Лысенку давялося прыкласці, каб знайсці сродкі на будаўніцтва павільёна. Калі б не яго настойлівасць і шанцаванне, музея магло б і не быць, а драўляныя знаходкі маглі спарахнець пад навесамі. Вучоны выпадкова выйшаў на старшыню савета міністраў СССР Касыгіна, сумеў перадаць яму ліст, у якім падзяліўся сваёй марай. Знайшліся грошы. Было дадзена распараджэнне ўраду БССР, і пачалася будоўля павільёна. Дарэчы, праектавалі яго вядучыя маладыя архітэктары, у будучыні яны ж працавалі над будынкамі новага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Цэнтральнага вакзала.

Старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі Наталля ДУБІЦКАЯ заўважыла, што музей мае важнае культурнае, навуковае і палітычнае значэнне. Доўгія гады нельга было з пэўнасцю сказаць, каму належалі гэтыя землі, толькі дзякуючы археалагічным даследаванням удалося даказаць, што горад Бярэсце быў заснаваны ўсходнеславянскім плямёнам дрыгавічоў і Бярэсце належала Тураўскаму княству. Музей мае выключную калекцыю — каля 45 тысяч знаходак. Гэта вялікі навуковы матэрыял, які патрабуе далейшай апрацоўкі.

Апошнія гады, трацячы апошняе здароўе, Пётр Лысенка дабіваўся, каб музей «Бярэсце» стаў самастойным. Давесці гэтую справу ён не паспеў. Сёння «Бярэсце» з'яўляецца адным з філіялаў Брэсцкага абласнога музея. І гэта адно з самых запатрабаваных месцаў у турыстаў: з сакавіка 1982 года музей наведала больш за 3,5 мільёна чалавек. Але для ўключэння гэтага ўнікальнага ў свеце музея ў спіс ЮНЕСКА неабходна, каб музей меў уласны юрыдычны статус.

ПАМЯЦЬ ПРА ПЕРШУЮ СУСВЕТНУЮ

Праблему, што рабіць са знаходкамі XX стагоддзя пры даследаванні археалагічных помнікаў папярэдніх эпох, узняў **вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі IX—XVIII стагоддзяў Алег ДЗЯРНОВІЧ**. Справа ў тым, што на тэрыторыі сучасната Крэва знаходзіцца шэраг аб'ектаў, якія з'яўляюцца гісторыка-культурнай каштоўнасцю. У сукупнасці з адметным ландшафтам і ацалелай тапаграфіяй мястэчка яны ўтвараюць гісторыка-культурны комплекс. Даследаванні вядуцца на некалькіх яго участках. Акрамя замка, зонай увагі археолагаў стала Юрава гара — найбольш высокае месца ў мястэчку, дзе трапляюцца знаходкі XIV—XV і пазнейшых стагоддзяў. У мінулым сезоне тут былі знойдзены сляды цэнтральнай драўлянай пабудовы памерам чатыры на чатыры метры. Магчыма, тут знаходзілася вежа дазорнага. На карысць гэтай гіпотэзы выступае тое, што агляд з княжацкай вежы Крэўскага замка, якая знаходзіцца ў нізіне, можа быць каля 10 кіламетраў, а з Юравай гары тэрыторыя праглядаецца на 50 кіламетраў.

Да гэтага часу яшчэ добра прачытваецца лінія акопаў Першай сусветнай вайны. Калі ў Крэўскім замку размяшчаліся нямецкія пазіцыі, то на Юравай гары былі расійскія. Крэўская зямля ўсыпана гільзамі і аскепкамі снарадаў. І даследчыкі вырашылі збіраць гільзатэку. Па клеймах на гільзах можна даведацца, з якога завода яны паступалі, і паспрабаваць высветліць інтэнсіўнасць баявых дзеянняў па гадах.

У мінулым сезоне былі праведзены даследаванні паўднёва-ўсходняй сцяны Крэўскага замка ў мэтах стварэння праекта кансервацыі. Сярод знаходак — аб'ект, які выклікалі як сметніцу Першай сусветнай вайны, дзе знойдзены бутэлькі добрай захаванасці і фаянсавая файка для курэння. Сёння, калі перад Смаргонскім раёнам стаіць задача па прыцягненні турыстаў, вядзецца пошук матэрыялаў, якія можна было б ім падаваць. Крэва з'яўляецца і месцам памяці часоў Першай сусветнай вайны.

Наогул, сучасная археалогія ва ўсім свеце ўсё больш увагі ўдзяляе гісторыі XX стагоддзя. Калі не хапае дакладных пісьмовых крыніц, раскопкі дазваляюць атрымліваць дадатковыя веды.

АДКАПАНЫЯ САКРЭТЫ

Летась маштабныя даследаванні праводзіліся на тэрыторыі Верхняга горада старажытнага Полацка: там, дзе вядзецца будоўля кадэцкага вучылішча. Сярод адкрыццяў сезона — выяўленне полацкага вала. Знойдзены шыкоўныя драўляныя канструкцыі, рэшткі гаспадарскіх пабудоў, брукаваных вуліц і частакола. Даследчыкі патрапілі ўсяго на дзве печы (хутчэй за ўсё ў гэтым месцы знаходзіліся нежылыя пабудовы), яны могуць пахваліцца больш як 1600 індывідуальнымі знаходкамі, сярод якіх грэбні, фрагмент кальчугі, адна з ліцейных формаў. Прадметы патрабуюць далейшага вывучэння.

У цэнтры Брэста вяліся раскопкі на тэрыторыі, дзе праектуецца будынак Гарадской Думы. Захаваліся фатаграфіі фасадаў гэтай пабудовы XIX стагоддзя. Падчас Першай сусветнай вайны горад моцна пацярпеў — драўляныя пабудовы былі спалены, а каменныя разбураны. І ўжо ў 1920—1930-я гады мінулага стагоддзя на месцы Гарадской Думы знаходзілася пажарная часць. Археолагі вялі раскопкі, каб высветліць памеры будынка і яго размяшчэнне.

Раскопкі на Мядзельшчыне некропаля другой паловы І тысячагоддзя н. э. падказалі вучоным новы кірунак для даследаванняў. Пабач з курганнымі пахаваннямі вялі знойдзены бескурганныя. І гэта першы падобны помнік на землях Беларусі. Але сёння па тэрыторыі лясной зоны Усходняй Еўропы выяўляюцца шматлікія бескурганныя некропалі. Напэўна, такая знаходка зменіць падыходы да вывучэння пахавальных традыцый. Сёння ўжо недастаткова даследаваць толькі візуальна бачныя канструкцыі — трэба вывучаць і прылеглую тэрыторыю.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Скарбніца

ЯКІЯ ДЫЯМЕНТЫ СХАВАНЫЯ Ў «НАЦЫЯНАЛЦЫ»?

Пяць цікавостак новай выстаўкі

Да свайго стагадовага юбілею Нацыянальная бібліятэка падрыхтавала шэраг сюрпрызаў. Тут ладзяцца выстаўкі, круглыя сталы, майстар-класы, цікавыя сустрэчы. Падчас такіх мерапрыемстваў бібліятэка пакрыце раскрывае свае сакрэты. Так, у музеі кнігі праходзіць выстаўка, прысвечаная рарытэтам. Тут прадстаўлены найбольш старажытныя кнігі і рукапісы. А днямі адкрылася новая экспазіцыя «Дыяменты стагоддзя: з бібліятэчнай калекцыі», якая знаёміць з навейшымі ўзорамі кнігадрукавання — як айчыннага, так і сусветнага — з 1922-га да 2022 года.

Сёння фонд Нацыянальнай бібліятэкі — звыш 10 мільёнаў экзэмпляраў, і ён прырастае на 200 тысяч дакументаў. Арыентавацца ў гэтых інфармацыйных скарбах няпроста. І новая выстаўка якраз дапаможа даведацца пра найбольш цікавыя кнігі, якія на працягу стагоддзя былі самымі запатрабаванымі ў чытачоў. У экспазіцыі прадстаўлены літаратурныя бестселеры, кнігі, адзначаныя на конкурсах. Напрыклад, першыя выданні твораў сусветнай класікі.

1. Даступныя рарытэты

У экспазіцыі пададзены факсімільныя выданні Тураўскага і Слуцкага Евангелляў, кнігі першадрукара Францыска Скарыны, Жыціе Еўфрасінні Полацкай і першы ў свеце буквар. Арыгінал апошняга захоўваецца ў Лонданскай бібліятэцы, але дзякуючы выдавецкай рабоце «нацыяналкі» сёння такія якасныя копіі старых каштоўных выданняў даступныя чытачам. Таксама прадстаўлены факсімільныя зборнікі класікаў беларускай літаратуры.

2. Кніжкі-малышкі

На выставе можна пабачыць калекцыю мініяцюрных кніжак (памер не перавышае 10 сантыметраў). Дарэчы, сярод самых першых мініяцюрных выданняў — справаздача з дзяржынскай раённай партканферэнцыі 1930 года. У 1960-х кніжкі-малышкі становяцца папулярнымі. На выстаўцы можна пабачыць, напрыклад, такі зборнік вершаў Якуба Коласа.

3. Сваімі рукамі

Выстаўка падкажа, якія выданні былі папулярнымі ў розныя дзесяцігоддзі. Статыстычныя звесткі падказваюць, што ў 1960—1970-я гады чыталі кнігі Івана Чыгрынава, Івана Шамякіна, Івана Мележа. Некаторыя творы друкаваліся ў часопісах. Бібліятэкары могуць згадаць, які быў ажыятаж на нумары, у якіх друкаваліся творы Караткевіча. На выстаўцы можна ўбачыць рукатворную кнігу з раманам «Чорны замак Альшанскі» — сабраную з надрукаваных у часопісах старонак.



4. Часопісы

У фондах бібліятэкі багата перыядычных выданняў. Напрыклад, захоўваецца тэхналагічны часопіс, які выйшаў у свет у 1804 годзе, выданні, якія друкуюцца з XIX стагоддзя ва нашага часу, ужо пастуліў у фонд свежы нумар часопіса «Вакол свету», а самы стары – з тых, што ёсць у бібліятэцы, — 1861 года.

Арганізатары абралі для экспазіцыі нумары, якія выходзілі з 1920-х гадоў мінулага стагоддзя. А каб прасачыць, як мянялася афармленне выдання, побач змясцілі іх сучасныя варыянты. Так можна пабачыць, якімі раней былі часопісы «Бярозка», «Алеся», «Беларусь», National Geographic, Popular Science і іншыя. Сярод цікавостак — часопіс «Трыбуна мастацтва», які ў 1925 годзе выходзіў на чатырох мовах (на той час дзяржаўнымі ў беларускай рэспублікі былі беларуская, руская, польская і яўрэйская). Заслугоўвае ўвагі і нумар «Маладога аратага», дзе змешчаны партрэт нашага першадрукара і частка тэксту, надрукаваная шрыфтам Скарыны.

5. Сведкі эпохі.

Карты, графіка, плакаты, календары, аўтаэферагты і дысертацыі, нотныя дакументы, аўдыявідэанасьбіты (пласцінкі, магнітныя стужкі, дыскі) таксама захоўваюцца ў фондах бібліятэкі і прадстаўлены ў экспазіцыі. Тут можна пабачыць нават рэдкія каляровыя пласцінкі, паслухаць сусветную класіку.

Літаратурныя музеі прадставілі для выстаўкі рэчы, што належалі пісьменнікам, сярод якіх чытацкія білеты, асадкі, закладкі, машынкадрукарка Рыгора Барадуліна, настольная лямпа Янкі Брыля, партфель Петруся Броўкі.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Пісьменніцкія вандроўкі

ВЕРШЫ З БРОВАРА, ВЯТРАК І ЖОЎТЫЯ ЛЬВЫ

Купалавымі шляхамі ў Яхімоўшчыну і вакол

...Бурлівая рэчка і млын гутарлівы
Адмерным, раскоістым плюскатам вод
Складалі мне рытму мастацкія звывы,
Парадквалі складаў раскоіцты ход...

Так пісаў Янка Купала пра крыніцы свайго натхнення ў вершы «Мая навука».
З яго млына пачалася наша чарговая вандроўка, гэтым разам — па Купалавых мясцінах.

Хоць у вершы гаворка пра вадзяны млын — Купала цалкам мог назіраць, як круцяцца крылы ветрака ля вёскі Салтанаўка... Пашарэлае ад часу дрэва, каменныя жорны, якія даўно не памятаюць дотыку зерня... Канструкцыя «казлоўка», якую яшчэ называлі нямецкай, — млын мог паварочвацца, каб «злавіць» вецер. Сёння крылы застылі на месцы ў чаканні Дона Кіхота, які захоча пазмагацца з заняпадам рарытэта.

Маленькі Іван Луцэвіч дакладна гуляў з равеснікамі ў такі млын — гэта калі дзеці стаяновяцца ў кола, а тры пары ў цэнтры круцяцца, імітуючы крылы:

Млынарня на горцы
Крыламі махае,
Крылами махае,
Зерне працірае,
Сама не глытае,
Другім хлеб выпякае.

Добрая, дарэчы, метафара для паэта, які аддае свой талент і сілы людзям...

Клямка, за якую браўся Купала

А наша дарога — у Яхімоўшчыну, куды ад Салтаноў пешкі, напрасткі — сем кіламетраў... Менавіта там Іван Луцэвіч працаваў памочнікам вінакура на броварах і стварыў вершы, што ўвайшлі ў першы зборнік «Жалейка».

Калі ўдаву Купалы, Уладзіславу Францаўну, прызначылі дырэктарам яго музея, яна ўпарта дамагалася зрабіць Яхімоўшчыну мемарыяльнай мясцінай. Сёння там дзейнічае філіял музея Янкі Купалы.

Экспазіцыя змяшчаецца ў доме для рабочых бровара, у адным з пакояў якога жыў малады Купала. Дойгі драўляны будынак з навесам над ганкам... Між іншым, XVIII стагоддзе! Сапраўды, падмурак высокі, каменны, з так званай разынкавай кладкай — гэта калі шы паміж камянямі ўпрыгожвалі маленькімі цёмнымі каменьчыкамі, сведчанне даўніны. На фасадзе — драўляная дошка: «У гэтай хаце ў 1906-1907 гг. жыў Янка Купала, народны паэт Беларусі». Абхопдзім будынак... Прастору побач аздобілі старыя гаспадарчыя прыладамі, не ўсе назвы ведаю... Купала вось ведаў дакладна.

Не была для яго праца на броварах жаданай... Але калі ў 1902 годзе памёр яго бацька, Дамінік Луцэвіч, арандатаркай усіх фальварках стала маці, Бянігна Іванаўна. Купала ж не ацчуваў паклікання прысвяціць сябе сельскай гаспадарцы. Вось і пайшоў на сведе — шукаць лёсу, ну і заробку. Кім толькі ні быў — хатнім настаўнікам, пісарам у судовага следчага, малодшым прыказчыкам, памочнікам вінакура... «...Зазнаў там такога пекла, якога яшчэ дагэтуль не меў», — успамінаў Купала свою працу на броварах (не на адным ён працаваў)...

Прынамсі, у Яхімоўшчыне меў асобны пакойчык — вам яго пакажуць, звернуць увагу на дзверы і клямку, што захаваліся ад тых часоў, раскажуць, як Купала запрашаў сюды гасцей, чытаў вершы, толькі не прызнаваўся, што ён — аўтар. Чаму? Ну, згадаем, што менавіта тады паэт напісаў «Чаго вам хочацца панове? / Які вас выклікаў прымус / Забіць трывогу аб той мове, / Якой азваўся беларус? / Чаму вам дзіка яго мова? / Паверце, вашай ён не ўкраў, / Сваё ён толькі ўспомніў слова, / З якім радзіўся, падрастаў...»

Паравы, на бульбяной сыраваце

Але былі і светлыя старонкі... Урэшце, нездарма ж Купала напісаў у Яхімоўшчыне столькі вершаў, у тым ліку праграмнае «А хто там ідзе...» Тут ад селяніна Парфёна пачуў страшную гісторыю з часоў прыгону, якая стала сюжэтам паэмы «Нікому...» — як пан падчас п'янога балявання распалаў гайдукоў прывесці для ўцехі нявесту з вясковага вяселля, а яе жаніх, каб не даваць каханую на здзек, засек яе сякерай, а сам згінуў на катарэе.

«Палац стаіць пусткай,
Жыць няма ў ім як, —
Здані ў ім здаюцца,
Быццам помсты знак».

А вось і яшчэ адзін будынак, больш дыхтоўны, каменны, ганак з балюстрадай, порцік... І таксама шыльда: «Тут у Яхімаўшчыне на броварах працаваў чорнарабочым народны паэт Беларускай ССР Янка Купала».

Выглядае на панскі палац... Аж не, палац, як прадказвала паэма «Нікому...», знішчаны яшчэ ў часы Першай сусветнай... Гэта ўсяго толькі афіцына, флігель, які выкарыстоўваўся як кантора і куды таксама даводзілася заходзіць будучаму народнаму паэту.

А палац меўся, бо Яхімоўшчына вядомая яшчэ з XVI стагоддзя, назву атрымала ад прозвішча першых уладальнікаў, Яхімовічаў. Потым гаспадарыў тут Юзаф Сулістроўскі, маршалак Ашмянскага павета, а з 1877-га — пан Ян Любанскі. Вось на яго сына, Аляксандра Любанскага, Янка Купала і працаваў... Маёнтак быў багаты: смалярня, маслабойня, сыраварня, цагельня, вяндлярня, млын... Калі агледзеўся, відаць там-сям рэшткі гаспадарчых падбудоў...

А мы ідзём туды, куды экскурсантаў звычайна не водзяць — да самога бровара, які трохі наводдаль, за панскай сажалкай... Падобна, што сёння будынкі не выкарыстоўваюцца, але яшчэ нядаўна працавалі — да старых мурой прытуліліся новыя, з шэрай сілікатнай цэглы... Але з-пад тынкоўкі там-сям паказваюцца чырвоная цэгла і каменны мур, што памятаюць і паноў Любанскіх, і памочнікі вінакура, які пісаў вершы. Бровар быў салідны — паравы, на бульбяной сыравіне. На франтонах будынкаў заўважныя лічбы: 1893, 1897.

Дарэчы, тут, на броварах, Купала таксама чытаў калегам свае творы, проста на месцы працы...

«Пры якіх акалічнасцях ствараліся мае першыя вершы? Цяжка сказаць. Калі займаўся земляробствам, былі адны акалічнасці, калі працаваў на броварах — другія, але і ў тым, і ў другім выпадку папера і аловак былі заўсёды пры мне. І вось, на працы ў полі, або ў дарозе, або на начлезе прыйдзе думка — і я пішу. На броварыто ж самае — ухтараюся адлучыцца, або нават у часе самой працы, калі павінен толькі назіраць, таксама пішу. Часам учачы, упацёмку запіскваю, а днём перапісваю».

Як Горкі даведаўся пра Купалу

Здарылася з паэтам і яшчэ адна важная падзея ў Яхімоўшчыне — пасябраваў з Андрэем Посахам, настаўнікам з суседняга Гарадзілава. Вельмі радасна было сустрэць аднадумца... Андрэй Посах, які пасля стане кандыдатам фізіка-матэматычных навук і вядомым педагогам, у 1910-м адпраўляе на Капры, дзе пазнаёміцца з Максімам Горкім. Раскажа яму пра свайго сябра, беларускага паэта Янку Купалу, а потым перашле зборнікі «Жалейка» і «Песні-жальбы».

Неаднойчы Купала наведваў Андрэя Посаха ў Гарадзілаве... Туды накіруемся і мы.

Першае, што бачым, — царкву святога Іосіфа Абручніка. Каменны храм, збудаваны ў 1866-м. Купала дакладна яго памятаў. Акуратная аранчая брама, неатынкаваная муроўка і белыя элементы дэкору... Збудаваны храм на месцы згарэлай Свята-Георгіеўскай царквы фундацыяй пана Коцела. Побач могілкі... І яшчэ адзін унікальны аб'ект у дварэ: жоўты помнік-капліча ў памяць загінулых у час Вялікай Айчыннай вайны воінаў з Гарадзілаўскага прыхода. «Помолись и отдай честь убиенным воинам в Великую Отечественную войну 1941-45 гг.» — значыцца на шыльдачцы... І прозвішчы загінулых па вёсках.

Справа гарадзілаўскага святара

Гэты помнік усталяваў у 1949 годзе святар Гарадзілаўскай царквы Аляксей Маеўскі. Нядаўна былі абнародаваныя дакументы пра тое, як мясцовыя чыноўнікі напалохаліся, што «служыцель культу» робіць несанкцыянаваны помнік, і спрабавалі яму перашкодзіць. Справа дайшла да Савета па справах Рускай праваслаўнай царквы пры Савеце Міністраў СССР. Упаўнаважаны Савета па Маладзеўчанскай вобласці Кадоўба 10 лютага 1950 года адчытваўся: *«27 чэрвеня 1949 года да мяне звярнуўся святар (благачынны) Гарадзілаўскай царквы Маеўскі А.І. з просьбай аказаць яму садзеянне ў набыцці цэменту і вапны для будовы помніка на могілках у в. Гарадзілава ў памяць загінуўшых воінаў Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг., прычым Маеўскі паведаміў мне, што ён ужо заказаў 3 мемарыяльныя дошкі ў г. Мінску ў майстэрні школы глуханямых з надпісам імёнаў і прозвішчаў загінуўшых. Паколькі для мяне было гэта пытанне не яснае, я яму дазволу на будаўніцтва помніка не даў і ў той жа дзень сказаў сакратару аблвыканкама тав. Дзядзічкіну, каб ён паведаміў старшыні Маладзечанскага райвыканкама тав. Шаўчэнку аб тым, каб не даваў Маеўскаму будматэрыялу на будаўніцтва помніка і, акрамя таго, я сам асабіста размаўляў з тав. Шаўчэнкам аб тым, каб не даваў святару Маеўскаму дазволу на будаўніцтва помніка».*

А калі святару ўсё ўдалося, там яшчэ і богаслужэнне зладзілі! Сёння цяжка такое ўявіць, але помнік на брацкай магіле, узведзены святаром, каб пазбегнуць «умацавання аўтарытэту» службовцаў культу, быў знесены... Тады Маеўскі зрабіў вось гэты мемарыял проста ў дварэ царквы, дзе ён дасюль і стаіць.

Але дарэмна чыноўнікі баяліся — аўтарытэт айца Аляксея Маеўскага быў высокі і без узвядзення помніка. У гады Вялікай Айчыннай бацюшка збіраў сродкі для дапамогі ваеннапалонным, асабіста выратаваў дзясяткі людзей, сярод якіх, між іншым, дырэктар Гарадзілаўскай школы Лідзія Корсак, пераемніца Андрэя Посаха...

Маеўскі пяцьдзясят гадоў служыў у Гарадзілаве.

Жоўтыя львы і Адэля з Устроні

Ад'язджаем трохі далей — і вось мы ўжо ў Бярэзінскім... Лічы, тое самае Гарадзілава — зліліся населеныя пункты... І тут выпадкова заўважаем двух ярка-жоўтых ільвоў, што ахоўваюць прысадy, якая вядзе да будынка з порцікам.. Ну як не збочыць?

Выявілася, недарэмна. Будынак адносна новы, 1950-х, тут клуб... А вось ільвы — ажно з XVIII стагоддзя. Сталі калісь у сядзібе Агінскіх Галянава... Пасля рэвалюцыі паставілі іх у Маладзечне перад вялікай мемарыяльнай аркай. Вось толькі не ўпісаліся панскія жывёлы ў новы пейзаж... І іх забралі сюды, у Бярэзінскае. Відаць, што падмалёўвалі шмат разоў... Апошні слой жоўтай фарбы, напэўна, дужа адрозны ад аўтэнтычнага колеру скульптур... Але, прынамсі, яны цэлыя, у кожнай нават свой пастамент. Ну і турыстаў прыцягваюць...

А было тут калісьці шмат турыстаў... Яшчэ калі не існавала Бярэзінскага — пасёлак узнік у 1951-м, калі ля Заходняй Бярэзіны пачалі здабываць торф... Тут быў маёнтак, які ў пачатку XVIII стагоддзя перайшоў ва ўладанне пана Тадэвушa Пузыны. А той меў гонар ажаніцца з самой паэткай Габрыэляй Гюнтэр, якой Адам Міцкевіч за паэму «Дабраўляны» падарыў пяро, атрыманае ім ад Гётэ.

Габрыэля выйшла замуж толькі ў 36 гадоў — занятая была духоўнай працай. На вяселле паэт Ігнат Ходзька напісаў верш, у якім называў нявесту «музай нашай зямлі». Так што Тадэвушу Пузыну давялося адпавядаць... Тут быў сапраўдны свецкі салон, дзе бывалі і Сыракомля, і Манюшка... А Адам Кіркор раскапаў каля Гарадзілава курганы, дзе знайшоў нават княжацкі меч...

Не ведаю, ці чуў Янка Купала пра вучоную гарадзілаўскую памешчыцу, якая, як мяркуюць даследчыкі, магла быць аўтаркай паэмы на беларускай мове «Мачаха», падпісаўшыся «Адэля з Устроні». Прынамсі, гэтую версію пераканаўча абгрунтоўваў Адам Мальдзіс. Але, несумненна, мясціны гэтыя натхнялі і Купалу...

Таму абавязкова прайдзіцеся шляхамі класіка, пабачце на свае вочы харастко беларускай зямлі, знайдзіце паэтаў нашай багатай гісторыі.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 698 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Брагинский КБО»** (УНН 400032430), 247632, Гомельская область, г. п. Брагин, ул. Советская, 31, тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **07 июля 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС (20 %)
1	Капитальное строение, инв. № 343/С-95792, Гомельская обл., Брагинский р-н, Малейковский с/с, ар. Малейки, ул. Октябрьская, 12. Общ. пл. 57,1 кв. м, здание специализированное для бытового обслуживания населения. Составные части и принадлежности: сарай, забор, покрытие. Кадастровый номер земельного участка 32038302036010001113	5950,00
2	Капитальное строение, инв. № 343/С-95793, Гомельская обл., Брагинский р-н, Новоколенковский с/с, ар. Красное, ул. Ленина В.И., 10. Общ. пл. – 69,5 кв. м, здание специализированное для бытового обслуживания населения. Составные части и принадлежности: пристройка, сарай, теневой навес, забор, покрытие. Кадастровый номер земельного участка 32038430260100060	6500,00
3	Капитальное строение, инв. № 343/С-95794, Гомельская обл., Брагинский р-н, Углянский с/с, д. Рудня Журавлево, 17. Общ. пл. – 83,4 кв. м, здание специализированное для бытового обслуживания населения. Составные части и принадлежности: сарай, ограждение. Кадастровый номер земельного участка 32038700710100019	6850,00

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 09.00 22.06.2022 г. по 17.00 06.07.2022 г. 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано 31.05.2022 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Брестского филиала, расположенного по адресу: г. Брест, пр-т Машерова, 21-2

На аукцион выставляется право заключения договоров аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

Лот 1: помещение на 4-м этаже в капитальном строении (здание АТС-3) общей площадью 355,9 кв. м по ул. Звездная, д. 3 в г. Пинске Брестской области.

1.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:

1 БАВ * 0,25 * 355,9 * 0,7 = **62,28 БАВ.**

Лот 2: помещение на 4-м этаже в капитальном строении (здание АТС-3) общей площадью 37,6 кв. м по ул. Звездная, д. 3 в г. Пинске Брестской области.

2.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка:

1 БАВ * 0,25 * 37,6 = **9,4 БАВ.**

Лот 3: помещение на 4-м этаже в капитальном строении (здание АТС-3) общей площадью 21,1 кв. м по ул. Звездная, д. 3 в г. Пинске Брестской области.

3.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка:

1 БАВ * 0,25 * 21,1 = **5,275 БАВ.**

Лот 4: помещение на 4-м этаже в капитальном строении (здание АТС-3) общей площадью 11,0 кв. м по ул. Звездная, д. 3 в г. Пинске Брестской области.

4.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:

1 БАВ * 0,25 * 11,0 = **2,75 БАВ.**

Лот 5: помещение на 1-м этаже в капитальном строении (здание АТС-3) общей площадью 21,3 кв. м по ул. Звездная, д. 3 в г. Пинске Брестской области.

5.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:

1 БАВ * 0,25 * 21,3 = **5,325 БАВ.**

Лот 6: помещения со вспомогательной площадью (коридор) общей площадью 31,3 кв. м, по ул. Стафеева, д. 21 в г. Бресте:

6.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:

1 БАВ * 0,25 * 31,3 = **7,825 БАВ.**

Лот 7: помещение площадью 10,5 кв. м, по ул. Стафеева, д. 21 в г. Бресте:

7.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:

1 БАВ * 0,25 * 10,5 = **2,625 БАВ.**

Срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи права и задатка согласно п. 8.2 Положения о порядке определения размера арендной платы, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150; коэффициент – 1,5, целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

Аукцион состоится 27 июля 2022 года в 14.00 по адресу: 224030, г. Брест, пр-т Машерова, 21-2 в малой студии Брестского филиала РУП «Белтелеком».

